**Адам Русак**

# У Пясоцкай школе

З кожнай вёскі раніцою
Многа хлопчыкаў, дзяўчынак
Йдуць дарогай снегавою
На аўтобусны прыпынак.

Йдуць з Пад’ельнікаў,
з Падцацкіх,
З Ганчароўкі і Віркова,
Ідуць з Малінаўкі, Зарудна,
І з Шамоў, і з Сінячова.

Сумкі поўныя іх кніжак,
І настрой у іх вясёлы,
І аўтобусы вязуць іх
Да Пясоцкай нашай школы.

У валёнках, цёплых шубках
Снежнай раніцай прыгожай
Назбіралася з ваколіц
Тут з паўтысячы іх можа.

Зазвініць званок працяжны,
Зашчабечуць арляняты
І спяшаюцца ў класы,
Хто у першы, хто ў дзясяты.

Іх прымае Дом навукі,
Цэлы дзень гудзе тут гоман,
І пра іх у свет далёкі
Нясе песню родны Нёман.

Ім настаўнік адкрывае
Свет вялікі, разнастайны:
Акіяны, горы, неба
І нязведаныя тайны.

Ім паказвае на карце,
Дзе пустэча, а дзе квецень,
Падарожнічаюць разам
Па вялізарнай планеце.

Вось яны сядзяць за партай,
Дасціпныя, азарныя,
Гэта – будучыня наша,
Нашы кветкі веснавыя.

Пазнаюць, чаго не зналі,
Дружаць з песняй веснавою,
У далі крочаць смелым
крокам,
Не шукаючы спакою.

Мы за іх у бой хадзілі,
Каб вайны яны не зналі,
Каб яны ўраджай расцілі
І Радзіму праслаўлялі,
З думай Ленінскай у сэрцы
Шчасце, долю будавалі.

**1971 год**

# Песачанская ўстанова адукацыі: гісторыя і традыцыі

**У 1863 годзе ў вёсцы Пясочнае была адкрыта першая школа і называлася яна “Народнае вучылішча”.** Каля сарака вучняў было ў вычылішчы, але дзяўчынак з іх - толькі тры. Хто быў першым настаўнікам невядома , але хутчэй за ўсё гэта гэта быў святар або семінарыст. Вядома, што ў пачатку ХХ стагоддзя ў школе працаваў настаўнік па прозвішчы Панько, які ў 1913 годзе выехаў з вёскі і стаў святаром.

У пачатку ХХ стагоддзя (1917 г.) ў Пясочным лічылася 2029 жыхароў. Паколькі ў Пясочным было многа яўрэяў, то **ў 1866 годзе была адкрыта яўрэйская школа.** Пасля яўрэйскія дзеці атрымлівалі адукацыю **ў двух яўрэйскіх школах І ступені.**

**У 1922 годзе ў Пясочным была адчынена 7-гадовая школа, у якой працавала 9 настаўнікаў і вучыліся 140 дзяцей, была адчынена хата-чытальня.** Пад сямігодку спачатку быў абсталяваны **дом** песачанскага бацюшкі, пазней былі выдзелены сродкі для будаўніцтва больш прасторнага памяшкання. Вядома, што **першым загадчыкам школы быў настаўнік-бежанец Шышко Іван**

**Аляксандравіч,** а яго дочкі Яўгенія Іванаўна і Ніна Іванаўна – настаўніцамі. Настаўнікаў не хапала, не было падручнікаў і сшыткаў. Але гэта на пужала немаладога загадчыка. Ён настойліва падбіраў выкладчыкаў сярод сваіх старых знаёмых. Сабраўся добры калектыў настаўнікаў.

**Прыехаў у родныя мясціны Іван Іванавіч Шаблюк, сваяк А. Астрэйкі,** які працаваў недзе на Палессі пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Блізкія былі вельмі рады, што ён прывёз з сабою тры падводы рознага дабра. Але пасля былі расчараваны, калі заведаліся, што гэта ўсё кнігі.

Рускую мову і літаратуру выкладалі настаўнікі Грынюк і Абаза, а **Шаблюк І. І. – беларускую мову і літаратуру. Ён здзіўляў вучняў тым, што мог гадзінамі чытаць па памяці творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Чарота, М. Багдановіча, К. Крапівы. З многімі мастакамі слова ён быў знаёмы асабіста.** Школьнікі вельмі любілі яго ўрокі.




**Вучнямі І. І. Шаблюка былі А. А. Умрэйка, А. Астрэйка і А. Русак.**

**У Пясоцкай школе таксама быў цудоўны духавы аркестр.** Аркестр часта запрашалі на разнастайныя мерапрыемствы і музыкантам плацілі. Але галоўнае, што радавала вучняў – музыкантам выдавалі ў школе шэвіётавыя касцюмы. У 1930 годзе аркестры былі два: школьны і калгасны. Яны

выкарыстоўваліся на рэвалюцыйных святах, на вечарах танцаў, на пахаваннях. Ролю капельмейстэра выконваў Зеньковіч. У 30-х гадах у Пясочным было шмат таленавітых дзяцей. Родны брат Анатоля Астрэйкі – Дзмітрый – мог іграць на некалькіх музычных інструментах.

**20 жніўня 1924 года** мястэчка стала цэнтрам Песачанскага сельскага савета. У ім было на той час **348 падвор'яў з 1918 жыхарамі.**

У 1928 – 1930 гадах ў Песачанскай школе-сямігодцы настаўнікам працаваў яе былы вучань

**С. А. Умрэйка.** 

Намаганнямі Сцяпана Андрэевіча і яго аднадумцаў Пясочнае стала адным з першых культурных цэнтраў на мяжы Капыльскага і Уздзенскага раёнаў. Сцяпан Андрэевіч прайшоў слаўны працоўны шлях - ад настаўніка Песачанскай сямігодкі (1928 – 1930 гг.) да прафесара, загадчыка кафедры педагогікі БДУ і намесніка Міністра адукацыі БССР.

**З мэтай увекавечання памяці члена-карэспандэнта Акадэміі педагагічных навук СССР у 1980 годзе Савет Міністраў БССР пастанавіў прысвоіць Песачанскай сярэдняй школе імя С. А. Умрэйкі.**

Таксама ў Песачанскай школе атрымалі адукацыю вядомыя беларускія **паэты-песеннікі Адам Русак і Анатоль Астрэйка,** доктар сельскагаспадарчых навук **Кот Сцяпан Аляксеевіч.**

**У 1952 годзе дырэктарам школы стаў Лазоўскі Баляслаў Адамавіч, удзельнік ВАВ.**

**29 снежня 1959 года быў зданы новы будынак Песачанскай сярэдняй школы.**

Песачанская школа ў той час часы славілася сваімі настаўнікамі. З 1953 года тут працавала настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства **Серада Марыя Сямёнаўна.** У 1965 годзе яна была прызначана намеснікам дырэктара. У 1966 годзе за дасягнутыя поспехі ў справе народнай асветы Марыі Сямёнаўне прысвоена

званне **Заслужанага настаўніка БССР.** Гонарам школы з’яўлялася і настаўніца рускай мовы і літаратуры Лагвіновіч Ірына Харытонаўна, узнагароджаная **Граматай Вярхоўнага Савета БССР.**

**9 мая** 1984 года не стала **Баляслава Адамавіча Лазоўскага.** Дырэктарам школы быў назначаны **Алег Вікенцьевіч Бурло.** Алег Вікенцьевіч выкладаў гісторыю, быў чалавекам шырокага кругагляду, умеў рашаць складаныя матэматычныя задачы. У 2008 годзе Алег Вікенцьевіч выйшаў на заслужаны адпачынак і дырэктарам стаў **Вадзім Мікалаевіч Ждановіч**, настаўнік чарчэння і працоўнага навучання. Песачанская сярэдняя школа афіцыйна стала называцца ДУА «Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа імя С. А. Умрэйкі». У 2018 годзе педагагічны калектыў узначаліла **Ірына Мікалаеўна Чаркоўская**, філолаг і лагапед.